ти часов вечера, вероятно, вследствие того, что не получили новые известия из Константинополя…» [7, д. 43, л. 50–50 об.].

Радость победы была омрачена новостью – 26 февраля командование батальона получило телеграмму об отправке 1-го гвардейского и гренадерских корпусов в Киев «для стоянки там резервом ввиду предстоящей войны с Австрией» [7, д. 43, л. 48–48 об.]. Ожидание отправки на родину затянулось. В мае Англия ввела в акваторию Мраморного моря свой флот. Русское командование вынуждено принять срочные меры. В таком состоянии – «ни войны, ни мира» – батальон провел два месяца, до окончания Берлинского конгресса. Только 22 августа на пароходе с пристани С. Стефано батальон был отправлен на родину. 13 сентября батальон торжественно вышел из Гатчины в Царское Село, где состоялись торжества в честь победителей.

19 сентября 1878 г. командир батальона объявил об отставке 102 чел. и увольнении в запас 270 военнослужащих. Так завершилась служба унтер-офицера А. А. Дунина-Горкавича в действующей армии.


1. Веремеев, Ю. Анатомия армии [Электронный ресурс] / Ю. Веремеев. – Режим доступа: http://army.armor.kiev.ua/hist/dubnak.shtml. – Дата обращения: 21.02.2014.
2. Дунин-Горкавич, А. А. Географический очерк Тобольского Севера (Доклад, читанный 22 апреля 1903 г. в Императорском Русском Географическом Обществе) / А. А. Дунин-Горкавич. – СПб. : Тип. М. Стасюлевич, 1904. –53 с.
3. Карцов, П. Исторический очерк лейб-гвардии Первого стрелкового Его Императорского Величества батальона с 1856 по 1885 год / П. Карцов. – СПб. : Тип. Ф. С. Сущинского, 1885. – 305 с.
4. Полозкова, Г. Поиски и открытия Дунина-Горкавича / Г. Полозкова // Дунин-Горкавич А.А. Нужды Тобольского Севера и меры для их удовлетворения. – Шадринск : Исеть, 1994. – С. 3–10 (Библиотечка журнала «Югра»).
5. Прибыльский, Ю. П. Жизнь и творчество А. А. Дунина-Горкавича / Ю. П. Прибыльский // Исследователь Севера Александр Дунин-Горкавич / сост. Н. И. Загороднюк. – М. : ГАЛАРТ, 1995. – С. 6–21.
6. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 387. Оп. 24. Д. 2400 (Личное дело А. А. Дунина-Горкавича).
7. Тобольский историко-архитектурный музей-заповедник (ТИАМЗ). Ф. 1. Оп. 1 (Фонд А. А. Дунина-Горкавича).
8. Устав о воинской повинности, Высочайше утвержденный 1 января 1874 года // ПСЗРИ. Т. 49. Отд. 1. № 52983. Глава 1. П. 1.– [б.м., б.д.]. (отд. оттиск).



**Антановіч З.В.**


## ВЫДАЧА ВЫПІСАЎ З МЕТРЫЧНЫХ КНІГ КАСЦЁЛАЎ МАГІЛЁЎСКАЙ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ КАНСІСТОРЫЯЙ У XIX – ПАЧАТКУ XX ст. (ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ НГАБ)

Адной з асноўных функцый канфесіянальных устаноў, у тым ліку рымска-каталіцкай царквы, да 1917 г. з'яўлялася рэгістрацыя грамадзянскага стану, што ажыццяўлялася ў метрычных кнігах аб народжаных, шлюбаваных і памерлых асобах [7]. Акрамя непасрэднага прызначэння яны шырока выкарыстоўваліся ў справаводстве рымска-каталіцкіх кансісторый для дэмаграфічнага і статыстычнага ўліку, прагназавання і аргументацыі развіцця прадстаўніцтваў царквы, а таксама ў даведачных мэтах. Азначаныя крыніцы з'яўляюцца падставовымі пры правядзенні генеалагічных даследаванняў, аднак, іх комплекс захаваўся не цалкам, што патрабуе прыцягнення іншых матэрыялаў, сярод якіх цікавасць прадстаўляюць выпісы з метрычных кніг. Нягледзячы на тое, што яны складаюць каля 25% складу архіўнага фонду "Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя" у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі(далей – НГАБ) і 30% матэрыялаў справаводства ўстановы [1], азначаныя дакументы амаль не выкарыстоўваюцца даследчыкамі з-за недаацэнкіх крыніцазнаўчага патэнцыялу і адсутнасці навукова-даведачнага апарату ў архіве. Пры гэтым у выпадках складанасцяў аднясення асобы да парафіі і незахаванасці асноўных генеалагічных крыніц, выпісы прадстаўляюць магчымасць далейшага правядзення даследавання.

Выпіс прадстаўляе сабой дакладны і завераны ўпаўнаважанымі асобамі запіс з метрычнай кнігі аб нараджэнні, шлюбе або смерці асобы, што надае навуковую вартасць нават іх фальсіфікацыям. Гэтыя дакументывыкарыстоўваліся прыватнымі асобамі і дзяржаўнымі установамі пераважна для пацвярджэння шляхецкага паходжання і рашэння судовых спраў. Інтэнсіўнай таксама была перапіска з прысутнасцямі па воінскай павіннасці ў мэтах фарміравання рэкруцкіх спісаў [2, арк. 7–8 адв.]. У першай трэці XIX ст. выпісы з метрычных кніг выдаваліся непасрэдна парафіяльнымі святарамі, азацвярджаліся дэканамі, што, аднак, не садзейнічала хуткасці разгляду [4, арк. 7–8 адв.]. Паводле скаргаў да мітрапаліта святары і кансісторыя затрымлівалі іх выдачу, нават тэрмін звыш года і збіралі за гэта сродкі. За іх дадатковым зацвярджэннем у Магілёўскую кансісторыю, дзе канцэнтраваліся копіі метрычных кніг


Рэпазіторый ВГУ

касцёлаў [3, арк. 4–6], звярталася толькі каля 40 асоб штогод [1, воп. 3]. У сувязі з разборам шляхты недастаткоЎы кантрольвыклікаў парушэнні і фальсіфікацыі біяграфічных звестак [9]. Так, члены Камісіі па праверцы актавых і метрычных кніг у 1833–1835 гг. сведчылі,што большасць з праверанных іміўкансісторыі мелі дапіскі іншым почыркам і атрамантам, а таксама падчысткі [6, арк. 179 адв.–185]. Сітуацыя ў парафіях не адрознівалася. Адпаведна,цывільнымі ўладамібыў дэталізаваны парадак выдачы выпісаў з метрычных кніг. У прыватнасці адзначалася, што біскупы мелі права прадстаўляць прасіцелям гэтыя дакументы пасля удакладнення- кансісторыяйз копіямі кніг касцёлаў пры адсутнасці сумніву ў сапраўднасці, што прывяло да росту колькасці зваротаўзвыш як у 10 разоў [1, воп. 1, 3;8, арт. 126, 1425]. За дэканаміпакідалася права іх выдаваць толькі па патрабаванніпрысутнасцяў па воінскай павіннасці для ўдакладнення ўзросту паступаючых на ваенную службу [8, арт. 1425]. Пры адсутнасці запісу ў метрычнай кнізе, неадпаведнасці даты нараджэння, імёнаў дзіця і бацькоў, наяўнасці выпраўленяў, рабілася даведка па спісах спавядаўшыхся ад пазначанага году нараджэння да даты звароту за выпісам, метрычным запісам аб шлюбаванні бацькой і перадшлюбных вобысках. Затым праводзілася следства, падчас якога апрошваліся сведкі і асобы, прысутныя на хрышчэнні [5, арк. 269–280 адв.; 8, арт. 127].

У 1844 г. арцыбіскупам быў павышаны кантроль за правільнасцю вядзення і захавання метрычных кніг у парафіях і выдачай выпісаў з іх, не дапускаючы зацягвання пад пагрозай крымінальнага суда за фальсіфікацыю дакументаў [4, арк. 1–2 адв.]. Аднак гэтыя дзеянні не мелі пазітыўнага эфекту і,нягледзячы на забарону, святары працягвалі выдаваць выпісы [4, арк. 61–67 адв.].Таму, з 1851 г. права выдачы выпісаў распараджэннем арцыбіскупа І. Галавінскага юрыдычна замацоўвалася выключна за кансісторыямі пасля звярэння сапраўднасці даных выпісу з кансісторскай копіяй метрычнай кнігі аб нараджэнні, шлюбе абосмерці асоб [4, арк. 7–8 адв.]. Выключэннем стаў касцёл св. Кацярыны ў Санкт-Пецярбургу, пробашч якога П. Юзэфавіч па дазволе міністра ўнутраных спраў меў права выдачы метрычных выпісаў. Яны зацвярджаліся Рымска-каталіцкай калегіяй па папярэднім завярэнні дэкана [4, арк. 16–16 адв.].

У 1855 г. да пытання аб выдачы выпісаў з метрычных кніг прыйшлося вярнуцца ў сувязі з зацягваннем працы кансісторыяй і ростам аб'ёма разглядаемых спраў да 600–700 штогод [1, спр. 3]. Высветлілася, што пробашчы своечасова не прадстаўлялі на завярэнне ў кансісторыю метрычныя кнігі і выпісы, таму іх разгляд зацягваўся на 8–10 месяцаў і больш. Пры гэтым, калі запісы аб нараджэнні не знаходзіліся ў кнігах, прашэнні аб правядзенні следства зацягваліся да ўдакладнення звестак. Першае слуханне прызначалася кансісторыяй праз тры і больш месяцаў, што было не адзіным парушэннем з яе боку. Напрыклад, у 1855 г. канцылярстам быў скрадзены пакет з гербавай паперай. Разглядам гэтых пытанняў займаўся другі стол, таму на члена кансісторыі ў веданні якога ён быў, ускладаўся абавязак тэрмінова разгледзець усе справы, а загадчык стала абавязваўся на працягу 7 дзён дакладаць усе паступаючыя справы. Кантроль укладаўся на сакратара, а дакладанне арцыбіскупу – віцэ-афіцыяла П. Келкевіча [4, арк. 32–34 адв.].

У сярэдзіне XIX ст. таксама былі ўдакладнены правіла афармлення выпісаў з метрычных кніг. Яны выдаваліся на на мове запісу з абавязковым перакладам на дзяржаўную [4, арк. 116–117] на гербавай паперы асобам свабоднага стану коштам па 90 кап. срэбрам за аркуш, а сялянам і мяшчанам – 15 кап., а ў апошняй чвэрці XIX ст. – 40 кап.Права на іх атрыманне меліасобы, якіх яны тычыліся непасрэдна, або бацькі і апекуныдля дзяцей [8, арт. 1426, 1431]. Выданыя парафіяльным духавенствам выпісы не набывалі юрыдычнай сілы зацверджаных кансісторыяй і мелі моц ахоўных дакументаў [4, арк. 61–67 адв.; 8, арт. 1431]. Разгляд кансісторыяй выдачы выпісаў з метрычных кніг фіксіраваўся ў выглядзе пратакола [4, арк. 49–53 адв.]. З 1857 г. на дэканаў і асобных куратаў ускладваўся абавязак прадстаўлення толькі спраўджаных копій метрычных кніг пад іх асабістую адказнасць у кансісторыю [4, арк. 60–60 адв.].

Чарговыя ўдакладненні ў выдачу выпісаў з метрычных кніг адбыліся ў 1870 г., што было выкліканаадсутнасцю пазначэння саслоўнай прыналежнасці сведак, а часам і іх саміх. Акрамя таго, у кнігах не адзначалася саслоўная прыналежнасць бацькоў або была няправільна пазначана, не запісвалася прыналежнасць да мяшчанскага таварыства [4, арк. 112–112 адв., 126–126 адв.]. Пры гэтым у дакументаабароце кансісторыі колькасць зваротаў пачала перавышаць 1000 штогод [1, воп. 3, 8–14]. Таму, паводле зацверджанага імператарам меркавання Дзяржаўнага савета азначаныя выпісы для дзяцей ніжніх чыноў ваеннай і марской службы,



Рэпазіторый БДУ

паштовага ведамства і іншых, за выключэннем канцылярскіх служачых грамадзянскага ведамства, выдаваліся на простай паперы [3, арк. 7–8 адв.].

У пачатку XX ст. этапы выдачы выпісаў з метрычных кніг, якія ўключалі зварот асобы, рапарт святара з дадаткам у выглядзе выпісу з запатрабаванай метрычнай кнігі ў кансісторыю, яго звярэнне служачымі азначанай установы з копіямі кніг, разгляд на пасяджэнні прысутнасці, а таксама зацвярджэнне, не змяніліся. Пры гэтым актуальнасць дадзеных дакументаў пастаянна ўзрастала. Так, у 1903–1919 гг. прысутнасцю Магілёўскай кансісторыі разглядалася ў сярэднім 1300 спраў аб выдачы метрычных выпісаў штогод [1, воп. 15–19]. Пры гэтым яны афармляліся ў буйных касцёлах на тыпаграфскім бланку з вызначанымі пастаяннымі рэквізітамі з-за іх значнай колькасці. Усярэдзіне аркуша тыпаграфскім спосабам нанесены від дакумента – метрычны выпіс, а затым аналагічным чынам пазначана прыналежнасць да касцёла і зацвярджэнне яго сапраўднасці, месца выдання, месца для даты і пасады святара. Улічваючы, што пастаянным рэквізітам бланку з'яўляецца назва касцёла, можна сцвярджаць яго друкаваўся ён для пэўнага касцёла. Пераменнымі данымі з'яўляецца пазначэнне чаткі кнігі, з якой зроблены выпіс, яе дата, нумар запісу і непасрэдна змест запісу, а таксама дата выдачы, подпіс і пячатка [2, арк. 7]. Так у 1902 г. быў афармлены выпіс з метрычнай кнігі Мінскага Марыінскага касцёла за 1882 г. аб нараджэнні Уладзіслава Палітанскага [2, арк. 5–5 адв.]. Аднак, у большасці касцёлаў яны афармляліся рукапісна [2, арк. 5–5 адв.]. Калі патрабаваліся звесткі аб шэрагу асоб ў пачатку XX ст., яны маглі афармляцца кансісторыяй ў выглядзе спісу, які завяраўся архіварыусам і членам яе прысутнасці. Так, у 1902 г. не знайшлі запісаў аб нараджэнні 11 з 27 запатрабаваных асоб па Клецкай і далучанай да яе Мядведзіцкай парафіі, якія падлягалі прызыву на воінскую службу. Пры гэтым звесткі аб сведках хрышчэння адсутнічалі [2, арк. 11–13 адв.]. Біяграфічныя звесткі пра жанчын і смяротнасць асоб больш цікавілі гарадскія ўправы, як пра Францішку Іванаўну Скроцкую, апра мужчын – па воінскай павіннасці прысутнасці, валасныя і гарадскія ўправы [2, арк. 24–29 адв.].

Такім чынам, на працягу XIX– пачатку XX ст. праца Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыі па выдачы выпісаў з метрычных кніг аб нараджэнні, шлюбе і смерці ўстановам і прыватным асобам змянілася як колькасна, так і якасна. Найбольшыя ўздымы выдачы гэтага віду дакументаў назіраюцца ў 1850-я гг. і пачатку XX ст., калі іх колькасць дасягала 1500–1700 штогод, што звязана з унутрыпалітычнымі падзеямі ў Расійскай імперыі.Іх размеркаванасць па месяцах была прыкладна раўнамернай на працягу існавання гэтай установы: ад 6,5 % у снежні да 9,5% – у сакавіку.Рост якасці выпісаў з метрычных кніг адлюстраваны ва ўніфікацыі патрабаванняў да іх зацвярджэння і прадстаўляемых звестак, у якія ўключалася як асабістая інфармацыя, так і саслоўная прыналежнасць. Увогуле, выпісы з метрычных кніг з'яўляюцца дапаможнай крыніцай пры правядзенні генеалагічных даследаванняў, таму што іх інфарматыўнасць абмежавана падставовымі біяграфічнымі звесткамі аб пэўнай асобе. Яны таксама могуць выкарыстоўвацца падчас статыстычных, дэмаграфічных і агульнагістарычных даследаванняў. На жаль, толькі каля 25 % ад агульнай колькасці выдадзеных выпісаў з метрычных кніг захавалася ў архіўным фондзе "Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя" у выніку правядзення экспертызы каштоўнасці падчас архіўнага захоўвання да сучаснага моманту. Нягледзячы на абмежаваную інфарматыўнасць, увядзенне дадзенага віду крыніц у навуковы ўжытак будзе садзейнічаць эфектыўнасці даследванняў па гісторыі Беларусі, генеалогіі ішэрагу спецыяльных гістарычных дысцыплін.

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1781. Воп. 1, 3, 8–19.
2. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 15. Спр. 74.
3. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 303.
4. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 25. Спр. 314.
5. НГАБ. – Ф. 1781. Воп. 27. Спр. 163.
6. НГАБ. – Ф. 3124. Воп. 1. Спр. 2.
7. Рыбчонак, С. А. Крыніцы масавага паходжання па генеалогіі беларусі сярэдзіны XVII – пачатку XX ст. (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі): аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.09 / С. А. Рыбчонак ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2010. – 26 с.
8. Свод законов Российской империи / под ред. Блудова Д. Н. – Санкт-Петербург, 1842. – Т. X.
9. Філатава, А. М. Дзейнасць камісій па разглядзе метрычных і актавых кніг у беларуска-літоўскіх губернях (1833–1851 гг.) / А. М. Філатава // Архівы і справаводства. – 2002. – № 5. – С. 92–95.



Репозиторий ВГУ